**МІНІСТЭРСТВА ФІНАНСАЎ**
**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Савецкая, 7, 220010, г. Мінск,
e-mail: minfin@minfin.gov.by
тэл. (017) 222 61 37, факс (017) 222 45 93
АКОДК 33220, УНП 100691903
р/р BY83AKBB36049000005730000000,
ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBB ЎY 2X

**МІНІСТЭРСТВА ФІНАНСАЎ**
**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Савецкая, 7, 220010, г. Мінск,
e-mail: minfin@minfin.gov.by
тел. (017) 222 61 37, факс (017) 222 45 93
ОКОГУ 33220, УНП 100691903
р/с BY83AKBB36049000005730000000,
ААТ «ААБ Беларусбанк», БІДА AKBB ЎY 2X

15.07.2020 № 1-1-22/46/КЛ-284
На № ______ ад ______

для інфармавання зацікаўленых

Аб беларускай мове на
чыгуначных квітках

Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь разгледзела калектыўны зварот грамадзян ад 01.07.2020 №46/С-284 аб беларускай мове на чыгуначных квітках і у межах кампетэнцыі паведамляе наступнае.

Па пытанні 1.

Праязныя дакументы, у тым ліку праязны дакумент АСУ «Экспресс», зарэгістраваны ў Дзяржаўным рэестры бланкаў каштоўных папер і дакументаў з пэўнай ступенню абароны, а таксама дакументаў з пэўнай ступенню абароны, і іх заказчыкам з'яўляецца Беларуская чыгунка.

Згодна са Службовай інструкцыяй да Пагаднення аб міжнародных пасажырскіх зносінах (СІ да ПМПЗ) бланкі праязных дакументаў вырабляюцца з элементамі абароны іх ад падробкі на паліграфічных прадпрыемствах у адпаведнасці з унутраным заканадаўствам дзяржаў.

Па заканадаўству Рэспублікі Беларусь паліграфічная прадукцыя, вырабленая з элементамі (сродкамі) абароны ад падробкі, належыць да бланкаў каштоўных папер і дакументаў з пэўнай ступенню абароны, а таксама дакументаў з пэўнай ступенню абароны (пастанова Савета

Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.12.2001 № 1846).

У адпаведнасці з параграфам 1 артыкула 6 Раздзела II Пагаднення аб міжнародных пасажырскіх зносінах (ПМПЗ) (разам з «Правіламі разгляду прэтэнзій, якія ўзнікаюць пры перавозках пасажыраў, багажу і таварабагажу ў міжнародных пасажырскіх зносінах») (далей – ПМПЗ) праязны дакумент можа быць афармлены як на бланку ўстаноўленай формы, так і ў электронным выглядзе.

Узоры праязных дакументаў прыведзены ў дадатку 1 да Службовай інструкцыі да Пагаднення аб міжнародных пасажырскіх зносінах (СІ да ПМПЗ).

У альбоме бланкаў праязных і перавозачных дакументаў (Дадатак 3 да Пагаднення паміж чыгуначнымі адміністрацыямі дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Грузіі, Латвійскай Рэспублікі, Літоўскай Рэспублікі, Эстонскай Рэспублікі аб асаблівасцях прымянення асобных нормаў Пагаднення аб міжнародных пассажырскіх зносінах (ПМПЗ) - ОП ПМПЗ) прыведзены ўзор праязнога дакумента АСУ «Экспресс» і яго апісанне на рускай мове.

Выраб бланкаў строгай справаздачнасці і спецыяльных матэрыялаў рэгулюецца пастановай Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 01.03.2002 № 30 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку вырабу бланкаў строгай справаздачнасці і спецыяльных матэрыялаў» (далей – Пастанова № 30).

У адпаведнасці з Пастановай №30 бланкі строгай справаздачнасці вырабляюцца ў падначаленых Міністэрству фінансаў дзяржаўных арганізацыях, за дзейнасць якіх ўпаўнаважаны адказваць Дэпартамент дзяржаўных знакаў Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржзнак), і (з дазволу Мінфіна) у іншых арганізацыях, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне дзейнасці на распрацоўку і вытворчасць бланкаў строгай справаздачнасці, а таксама спецыяльных матэрыялаў для абароны іх ад падробкі.

Для вырабу бланка заказчык перадае прадпрыемству-вытворцу неабходныя матэрыялы, у тым ліку тэкставы змест бланка і прапановы па мастацка-графічнаму афармленню.

Улічваючы выкладзенае, прапануем для вырабу новых бланкаў праязных дакументаў на цягнікі рэгіянальных ліній бізнес-класа, міжрэгіянальных і міжнародных ліній на беларускай мове або на дзвюх дзяржаўных мовах звярнуцца да заказчыка гэтых бланкаў – Беларускай

чыгункі з прапановай аб распрацоўцы новых узораў бланка.

Пры звароце Беларускай чыгункі ў адрас Дзяржзнака па пытанні вырабу новых бланкаў праязных дакументаў, іх рэгістрацыя і выдача дазволу на выраб ажыццявяцца ў самыя кароткія тэрміны.

У адпаведнасці з артыкулам 22 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» просім праінфармаваць усіх заяўнікаў згодна з прыкладзеным да звароту спісам.

Пытанні 2, 3, 4 звароту не адносяцца да кампетэнцыі Міністэрства фінансаў, і ў адпаведнасці з артыкулам 15 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» застаюцца без разгляду па сутнасці.

Намеснік Міністра У.В.Татарыновіч

Кірыенка 203 67 12
09.07.2020 Аб чыгуначных квітках/Звароты